Весці БДПУ. Серыя 1. 2022. № 3. С. 147–149

УДК 821.161.3:82-1

# АДЛЮСТРАВАННЕ ТЭМЫ РАДЗІМЫ І ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ Ў ПАЭТЫЧНАЙ СПАДЧЫНЕ МАКСІМА ТАНКА

**А. У. Жардзецкая,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 06.07.22.

UDC 821.161.3:82-1

# REFLECTION OF THE THEME OF FATHERLAND AND HISTORICAL MEMORY IN THE POETIC HERITAGE OF MAXIM TANK

**A. Zherdetskaya,**
*PhD in Philology, Associate Professor of the Department of Belarusian and Foreign Literature, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 06.07.22.

У артыкуле разглядаюцца праблемы любові да Радзімы і гастарычнага асэнсавання лёсу беларускага народу. Танкаўская паэзія стала ўвасабленнем набалелых праблем ХХ ст., яна сканцэнтравала ў сабе і глыбокія асабістыя перажыванні, і аб'ектыўныя зрухі ў грамадстве, і самы шырокі спектр быційных пытанняў.

*Ключавыя словы*: патрыятызм, гістарычная памяць, зямля бацькоў, грамадзянскі абавязак.

The article considers the problem of love to the Fatherland and historical interpretation of fate of the Belarusian people. Tank's poetry has become the embodiment of painful problems of the 20th century, it also has concentrated in itself deep personal experience, objective shifts in the society, and the widest specter of existential notions.

*Keywords:* patriotism, historical memory, Fatherland, civic duty.

Паэзія Максіма Танка заўсёды абуджала гістарычную памяць, ажыўляла крыніцы народнай творчасці, з'яўлялася глыбіннай асновай духоўнасці і мастацтва. М. Танк умела валодаў мілагучным і маляўнічым беларускім словам, умеў адчуць яго сапраўдны паэтычны сэнс, асацыятыўнасць і шматзначнасць. У розны час тэматыка, праблематыка, ідэйная скіраванасць танкаўскай паэзіі былі разнастайныя, але ўся яго творчасць прасякнута найвялікшай любоўю да Радзімы, якая была для паэта неад'емным ад чалавечага існавання паняццем, велічным і святым. Яно нават стала для яго культавым, якое паступова вырастае да духоўна-філасофскага канцэпту. Пра гэта сведчаць шматлікія вершы Танка: «О родная зямля!», «Ёсць у сусвеце планета Зямля...», «Вецер Радзімы», «Божа мой шчодрасці...», «Ёсць на маёй Радзіме...», «Гэта зямля – нічым не прыкметная» і інш.

З самага пачатку сваю эстэтычную місію паэт усведамляў як грамадзянскі абавязак служэння Бацькаўшчыне. Максім Танк яшчэ ў маладыя гады выразна адчуў, што «лірыка, як крыніца з зямлі, заўсёды бярэ свой пачатак з біяграфіі самога паэта». Таму непаважлівае стаўленне да ўсяго роднага азначала для паэта і адмаўленне яго паэтычнай існасці, самога яго таленту. «Вось чаму Максім Танк ужо ў дакастрычнёўскія часы недвухсэнсоўна асуджаў "паэзію без радзімы", з горыччу і кплівасцю гаварыў пра тых літаратараў, якія, называючы сябе рэвалюцыянерамі, саромеліся прызнацца ў любові да свайго роднага кутка, да сваёй хаты, сям'і, каб не палічылі іх абмежаванымі» [1, с. 133].

Радзіма для паэта не толькі прырода роднага краю, краса яго лясоў і рэчак, лугоў і палёў. Радзіма – гэта найперш людзі, шчырыя і сумленныя працаўнікі, землякі пісьменніка, на якіх трымаецца свет. Максім Танк умее дакладна і псіхалагічна тонка раскрыць іх няпросты лёс, паказаць духоўную прыгажосць. Усё, што звязана з народным жыццём, памяццю, народнай этыкай і мараллю, набывае ў яго вершах асабліва глыбокі сэнс («Вучыўся ў іх плесці лапці, араць, засяваць загоны і з сосен, смалістых, гонкіх, трывалыя зрубы стаўляць...»). Талент паэта, яго моц і глыбіня, выявіліся ў вершах «Гісторыя вёскі Пількаўшчына», «Вёска мая», «Ля старой хаціны», «Пра філосафаў», «Сямейны фотаздымак», «У гэты дзень» і інш., у якіх ён пераасэнсоўваў маральна-этычныя і духоўныя каштоўнасці, набытыя нашым народам. Так, у вершы «Гісторыя вёскі Пількаўшчына» паэт у жартаўлівай форме распавядае гісторыю сваёй вёскі, пачынаючы ад падзення антычнай Троі. Героямі верша «Пра філосафаў» з'яўляюцца мудрыя вясковыя філосафы: сусед Юрка, сталяр Марка, дзед Хведар і бацька, якія вучылі рабіць дабро, паважаць слова і песню, хлеб і дружбу: «Лепей жменя дружбы, / Як бочка золата. / Не кідай хлеб, / Каб ён цябе не кінуў» [6, с. 326].

У шматлікіх танкаўскіх вершах («Беларусь», «Кожны дзень», «Паэзія», «Я піў рачную плынь кіпучую» і інш.) Радзіма атаясамліваецца з маці, жанчынай, песняй. Так, у вершы «Паэзія» Радзіма і маці – неадлучныя, як неадлучная ад іх і сапраўдная – патрыятычная і чалавекалюбная – паэзія: «Ты – кроў, што пульсуе па жылах, / Ты – сонца, якое / Прасторы святлом азарыла. / І без чаго, як без маці / Або без радзімы, / Ні нараджацца, ні жыць / На зямлі немагчыма» [6, с. 366].

Беларусь у паэзіі Максіма Танка адухоўленая, раскрытая ў шматграннасці і разнастайнасці вобразаў. Гэта найбольш ярка выявілася ў вершы «Беларусь», дзе Радзіма выступае і ў вобразе сіраціны, і гаручай каліны, як сонца ўзнятага сцяга, дарогі жыцця, а таксама несмяротнай песні. У суровы ваенны час Беларусь становіцца партызанкай, якая дапамагае свайму народу: «Ты падыходзіш, партызанка, / Хадою ціхаю да нас. /

Каму гаючы сон дасі, / У будучыню шлях пакажаш, / Каму паможаш пагасіць, / Развеяць сум на верасы / І чула раны перавяжаш» [6, с. 84].

Своеасаблівым кодам да творчасці М. Танка можа служыць яго верш «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...»: «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма, / І калі мо не на ўсе песні хопіць / Адмеранага лёсам часу, ведай: / Я дапяю іх, нават калі буду / Пясчынкай на тваіх шляхах бясконцых, / Сасной на нарачанскім узбярэжжы / Ці жаўруком – прадвеснікам жыцця» [6, с. 140].

Верш жыццясцвярджальны, напоўнены светлымі колерамі і адчуваннем шчасця ад бясспрэчнай запатрабаванасці таленту паэта і ўсведамлення ім сваёй галоўнай эстэтычнай місіі – служэння Бацькаўшчыне.

У лірыцы М. Танка прысутнічае шэраг вобразаў, якія ў рознай інтэрпрэтацыі паўтараюцца ў многіх творах: зямля, дарога, вада, агонь, жыта, хлеб, Радзіма, песня, сонца, месяц, зоры, цымбалы, скрыпка, бубен і інш. «У мастацкай палітры яны яднаюць час і прастору. Мастацка-вобразная сістэма, створаная М. Танкам, вылучаецца і касмаганічнасцю, і прадметна-побытавымі рэаліямі. Раўнапраўныя “суразмоўцы” паэта, побач з чалавекам, – нябесныя свяцілы, з'явы жывой і нежывой прыроды. Умоўна-асацыяцыйны падтэкст ствараецца з дапамогай метафарычнасці, здольнай паяднаць далёкае і блізкае, зямное і касмічнае» [2, с. 9].

Напрыклад, у вершы «О родная зямля!...» вобраз зямлі больш разглядаецца ў сферы духоўнай. Паэт параўноўвае зямлю з кнігай вечнага жыцця, бо ў ёй назапашана памяць цэлых пакаленняў, шмат слядоў гістарычнай даўніны: «О родная зямля! / Ты – кніга вечнага жыцця, / Не раз я плугам раскрываў / Твае старонкі-скібы / І вывучаў па іх / Тваю гісторыю, / Запісаную валунамі, / Крывей, агнём і потам» [6, с. 118].

Як адзначае Л. Гарэлік, «умоўнаасацыяцыйныя рэаліі грунтуюцца на паняццях гістарычнай і побытавай канкрэтыкі. Валуны скіроўваюць увагу да ледавіковай эры, кроў, агонь, пот – сімвалы ваярскай і працоўнай дзейнасці чалавека цягам многіх стагоддзяў» [2, с. 9].

У мастацкай свядомасці М. Танка зямля з'яўляецца адным з самых значных топасаў. Асэнсаванне зямлі як стыхіі жыцця і космасу – вызначальная рыса натурфіласофіі паэта. У яго творчасці мы назіраем культавае стаўленне да зямлі, да прыроды. Так у філасофскім вершы «Мой хлеб надзённы» паэт найперш звяртаецца да зямлі і гаворыць пра непасрэдную залежнасць асабістага шчасця ад грамадска-гістарычнага лёсу народа. Лёс і жыццё паэта – гэта родная зямля, якая была для яго «хлебам надзённым» – самым дарагім і неабходным у жыцці: «Непакой за цябе, зямля мая, / За твой ураджай, спакойны сон, / За дрэва кожнае ў гаях, / За весніх песень перазвон, / Непакой за цябе, зямля мая, – / Мой хлеб надзённы» [6, с. 283].

Асаблівую інтэрпрэтацыю любові да Радзімы дае М. Танк у вершы «Аслепшы...». Твор пабудаваны ў форме разгорнутага параўнання, у кожнай страфе абгрунтоўваецца страта той ці іншай якасці чалавека. Але на думку паэта, самай вялікай з'яўляецца страта Радзімы. Яе можна параўнаць толькі з поўнай бездапаможнасцю чалавека: «Толькі страціўшы Радзіму, / Будзеш, як камень, / Сляпы, і глухі, і нямы» [6, с. 112].

Такім чынам, ствараючы вобраз Радзімы, Максім Танк паказвае нам народнае жыццё ва ўсёй шматстайнасці – у жывых, трапяткіх сувязях сучаснага і спрадвечнага. Гэта жыццё адбіваецца праз успрыманне яркай, дынамічнай і шматграннай асобы аўтара.

З тэмай Бацькаўшчыны вельмі цесна звязаны шматлікія творы, у якіх глыбока асэнсоўваецца нацыянальная гісторыя. Цікавасць да гэтай тэмы выявілася яшчэ ў даверасн ёўскі перыяд творчасці Максіма Танка, калі ён напісаў гераіка-рамантычную паэму «Нарач» пра паднявольнае жыццё працоўнага народа ў Заходняй Беларусі, яго неадольную прагу да вызвалення і веру ў перамогу, а таксама паэму «Каліноўскі» пра нацыянальнага змагара, які ўзначаліў на Беларусі паўстанне 1863–1864 гг. У паэме «Мікалай Дворнікаў», напісанай у 1970-я гг., М. Танк глыбока адлюстраваў дзве паралельныя арэны барацьбы аднаго з кіраўнікоў заходнебеларускага падполля – заходнебеларускую і іспанскую. Гераічнае мінулае асэнсоўваецца паэтам і ў жанры балады («Балада пра партызана Дубягу», «Балада пра Гаркушу», «Партызанская балада» і інш.). Многія танкаўскія творы ўзбагачаныя літаратурнымі, гістарычнымі і культурнымі рэмінісцэнцыямі, і форма кароткай балады добра стасуецца з ягоным узнаўленнем гістарычных падзей і персанажаў.

Шэраг вершаў М. Танк прысвяціў вядомым гістарычным постацям – волатам духу («Францішак Багушэвіч», «Акамянелыя волаты», «Гравюры Скарыны» і інш.). Так, у вершы «Акамянелыя волаты» паэт пералічвае імёны тых славутых людзей Беларусі, дзякуючы якім мы захаваліся як народ. Духоўны подзвіг вялікага сына беларускага народа – гуманіста і філосафа Францыска Скарыны – адлюстраваны ў вершы «Гравюры Скарыны». Паэтам раскрываецца ідэя неўміручасці спадчыны славутага суайчынніка. Гравюры Скарыны, выразаныя асветнікам «на спаконвечным / Дрэве гісторыі / Свайго народа», маюць чароўную сілу, бо «выразаў ён іх / Не штыхелем-разцом, / А промнем сонца, / Промнем сваей веры і любові да народа» [6, с. 124], таму такі глыбокі след застаўся ў памяці чалавецтва аб нашым першадрукары, які не змаглі знішчыць «Ні агонь, ні забыццё, ні ворагі, ні час» [6, с. 124]. Гравюры ўвасабляюць і драматычны лёс першадрукара, і яго любоў да роднай зямлі, і гуманізм.

Галерэю волатаў духу працягвае пісьменнік і ў зборніках 1990-х гг. Творчая місія і прызначэнне на беларускай зямлі вядомага пісьменніка і фалькларыста Язэпа Драздовіча раскрываецца ў вершы «Язэп Драздовіч». Шчодра надзелены незвычайным талентам, які дапамог яму: «У нашым краі з часам стаць вядомым, / Уладаром за-

чараваных фарбаў, / Збіральнікам свайго народа скарбаў, / І непаўторным самавітым творцам...» [5, с. 31]. І пакінуць значны след у гісторыіі беларускай культуры.

Іншаму блізкаму аўтару па духу, паэту-змагару за нацыянальнае адраджэнне прысвечаны верш «Над магілай Янкі Купалы». Жалобна-ўрачыстая танальнасць верша дазволіла М. Танку вызначыць велічнасць асобы пачынальніка нацыянальнай літаратуры і сапраўднага патрыёта роднага краю: «Нішто такім не аддаецца / Грымотным, балючым у сэрцы – / Ні хваляў марскіх вал дзявяты, / Ні гул несціханы набату, / Ні рокат падземнага грому, / Ні роў і не стогн буралому, / Як кінутая жменька гліны / На века тваёй дамавіны» [6, с. 35]. На думку паэта, жыццё і дзейнасць такіх асоб з'яўляецца ўзорам маральнай дасканаласці і грамадзянскай самаахвярнасці.

У зборніках 1990-х гг. «Мой каўчэг» (1994) і «Errata» (1996) М. Танк, як С. Грахоўскі, А. Сыс і іншыя, асэнсоўвае трагедыйныя старонкі савецкай гісторыі. У вершах «Курапаты», «Рэабілітацыя» пісьменнік раскрывае новую для нацыянальнай літаратуры таго часу тэму рэпрэсіўнай палітыкі ўлады да свайго народа. «Мо не знаеш імён, / Але знай: ноч і дзень / Тут расстрэльвалі каты / Нявіных людзей. / Тут расстрэльвалі / І дзяцей і бацькоў, / Нашу праўду, / Братэрскую дружбу, любоў...» [4, с. 9]. Паэт акцэнтуе ўвагу на тым гістарычным момантце, што тыя, каго бязвінна расстрэльвалі, свята верылі ў сацыялізм і паміралі з вераю ў неўміручасць гэтай ідэі.

Верш «Рэабілітацыя» яшчэ глыбей раскрывае трагедыю беларускага краю, дзе ў большасці пад рэпрэсіі траплялі прадстаўнікі вёскі, працаўнікі і адначасова ўласнікі за сваю любоў да зямлі і святую веру ў бога, якую адзін з правадыроў рэвалюцыі назваў опіумам для народа. Таму і «з'ява рэабілітацыі народа ўвасабляецца ў вобразе сельскай “цэркаўкі”»: «Сягоння зноў прыбралася яна, / Як на Вялікдзень, / Уздзела крыжаносны купал, / Прытвор ачысціла / Ад гандляроў і фарысеяў / І кліча звонам багамольным / Вярнуцца / З ўсіх лагераў і ссылак / Сваіх дзяцей – жывых і мёртвых – / Сваіх святых. / Каб занялі належныя ім месцы / На незагоеным яшчэ / Ад тапароў і куль / Іканастасе» [4, с. 57]. Рэабілітаваная царква паўстае сімвалам духоўнасці, згуртавання народа, адраджэння забытых і занядбаных шляхоў [3, с. 66].

Такім чынам, ствараючы вобраз Радзімы, творчасць Максіма Танка з'яўляецца вядучым арыенцірам у пошуку адказаў на пытанні, што ставіць час, яго духоўна-гуманістычныя супярэчнасці, абумоўленыя грамадска-сацыяльным зрухам у свеце. Пісьменніка вызначае імкненне да паглыбленага асэнсавання духоўных каштоўнасцей чалавека, паэтызацыі народнай самасвядомасці, зямных першаасноў, а таксама ўменне асвятляць праблемы сучаснасці гістарычным вопытам стагоддзяў.


### Літаратура

1. *Бугаёў, Д.* Выдатны паэт славянскага свету / Д. Бугаёў // Чалавечнасць : Літ. крытыка. – Мінск : Маст. літ., 1985. – С. 119–152.
2. *Гарэлік, Л.* Зямля мая, любоў мая...” Развагі пра творчасць Максіма Танка / Л. Гарэлік // Роднае слова – № 8. – 2002. – С. 5–10.
3. *Заяц, Н. В.* “Гартаючы старонкі гісторыі...” : мастацкае асэнсаванне мінулага ў паэзіі Максіма Танка канца 1980 – пачатку 1990-х гг. / Н. В. Заяц // Восьмыя Танкаўскія чытанні: матэрыялы Міжнар. навук. канф., г. Мінск, 13–14 верас. 2012 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал. В. Д. Старычонак, І. М. Гоўзіч [і інш.]. – Мінск: БДПУ, 2012. – С. 64–68.
4. *Танк, М.* Мой каўчэг : вершы. 1989 – 1992 / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 207 с.
5. *Танк, М.* Errata : вершы, пераклады / М. Танк. – Мінск : Маст. літ, 1996. – 143 с.
6. *Танк, М.* Мне пару крыл дало юнацтва : выбраная лірыка / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 479 с.

### References

1. *Bugayoў, D.* Vydatny paet slavyanskaga svetu / D. Bugayoў // Chalavechnasc' : Lit. krytyka. – Minsk : Mast. lit., 1985. – S. 119–152.
2. *Garelik, L.* Zyamlya maya, lyuboў maya...” Razvagi pra tvorchasc' Maksima Tanka / L. Garelik // Rodnae slova – № 8. – 2002. – S. 5–10.
3. *Zayac, N. V.* “Gartayuchy staronki gistoryi...” : mastackae asensavanne minulaga ў paezii Maksima Tanka kanca 1980 – pachatku 1990-h gg. / N. V. Zayac // Vos'myya Tankaўskiya chytanni: materyyaly Mizhnar. navuk. kanf., g. Minsk, 13–14 veras. 2012 g. / Bel. dzyarzh. ped. un-t imya M. Tanka; redkal. V. D. Starychonak, I. M. Goўzich [i insh.]. – Minsk: BDPU, 2012. – S. 64–68.
4. *Tank, M.* Moj kaўcheg : vershy. 1989 – 1992 / M. Tank. – Minsk : Mast. lit., 1994. – 207 s.
5. *Tank, M.* Errata : vershy, peraklady / M. Tank. – Minsk : Mast. lit, 1996. – 143 s.
6. *Tank, M.* Mne paru kryl dalo yunactva : vybranaya liryka / M. Tank. – Minsk : Mast. lit., 2003. – 479 s.